16+

Вожык

Часопіс сатыры і гумару

12 • 2020
снежань

Віталь ДУДКА.

Малюнак Анатоля ГАРМАЗЫ, падрабязнасці на 7 старонцы.

Янусь МАЛЕЦ

Зімовыя парадоксы

Дыптых

1

Ізноў на пару дзён зіма,
А там – глядзіш – яе няма!
З'ядуць заходнія вятры
На тыдні два, а можа, тры.

З чырвоным носам снегавік
Будзе глядзець на чарнавік
І, аслабелы, разбіраць,
Што ўзнёслае хацеў сказаць.

І зноў пачне гадаць народ,
Ці будзе снежным Новы год?

2

Зіма прапала без прычын...
Стаю, гляджу ў акно адзін.
На сэрцы ад чагось пагана...
«Калі ўжо пойдзеш па смятану?!» –
Гукае жонка нечакана.

На кухні ёй не да зімы,
Глядзець не хоча на дамы,
На неба сінь і на дымы,
І ў тым няма яе віны:
Гатуе драныя бліны!

Андрэй СІДАРЭЙКА

Я абяцаю!

Гумарэска

Для многіх першага студзеня пачынаецца з банальных паслясвяточных фраз: «Колькі цяпер часу?», «Дзе гэта я?», «Вады!..» і падобных. Ачуняўшы, людзі яшчэ раз паўтараюць: «Больш ніколі ў жыцці!» і даюць слова, што ў новым годзе...

– Я зраблю турнік у двары і буду кожную раніцу падцягвацца.

– Я разлюблю пельмені і палюблю мюслі.

– Я не буду закусваць снегам.

– Я пачну выносіць смецце без пастаянных жончыных напамінаў.

– Я абяцаю не зазіраць у піўбар, ідучы з працы дахаты.

– Я перастану піць каву на галодны страўнік і курыць на кухні ў фортку.

– Я кіну знаёміць суседзяў са сваёй любімай музыкай.

– Я ніколі не буду казаць: «Больш ніколі ў жыцці!»...

Гэта некаторыя з абяцанняў мужчын. А вось пра што божацца жанчыны.

– Я сяду на дыету другога студзеня і не злезу з яе, пакуль не пахудзею.

– Я больш ніколі не буду траціць грошай болей, чым зарабляю.

– Я забудуся дарогу ва ўсе модныя буцікі.

– Я перастану глядзець тэлепраграму «Дом-2».

– Я ніколі не папрашу ў мужа ягоную банкаўскую карту.

– Я пачну выключаць тэлевізар, калі пачынаецца любы серыял.

– Я не буду перашкаджаць мужу глядзець спартыўныя каналы і вывучу прозвішчы ўсіх знакамітых спартсменаў...

Калі навагоднія святы мінаюць, надыходзіць час выконваць абавязацельствы.

– Я не магла такога абяцаць! – абураецца кабета. – Вечна вы, мужчыны, чуеце толькі тое, што мы, жанчыны, кажам! На самай справе я мела на ўвазе зусім іншае. Эх, хіба вы разумееце нашую загадкавую душу?

Моцная палова ў сваю чаргу больш лаканічная:

– Прашу зразумець і прабачыць...

І жыццё працягваецца далей. Да наступнага Новага года і новых абяцанняў!

Рэчыцкі раён,
агр. Каравацічы.

Іголкатэрапія

У госці да казкі

Гомель. Тры медсястры ў дзвюх установах агульнай сярэдняй адукацыі адчулі сябе ў алагічным Залюстроўі са знакамітай кнігі англійскага пісьменніка Льюіса Кэрала. Працавалі не горш, чым у снежні 2019 года, ды атрымалі ў цэлым на амаль 400 рублёў менш, чым за студзень 2020. У госці да казкі яны трапілі дзякуючы непамятлівасці кіраўнікоў. Тыя забыліся, што пры новай сістэме аплаты працы не толькі скасавалі некалькі нарматыўных актаў, але і не ўвялі стымулюючыя і кампенсацыйныя выплаты.

«Чары» знялі кантралёры. Грошы даналічылі.

Звязалі…

Брэст. Два гараджаніны гандлявалі анлайн вязанымі вырабамі і ў рэшце рэшт звязалі сябе па руках і нагах. З 2016 па 2019 гады праз інтэрнэт-магазін яны набывалі адзенне ў беларускіх вытворцаў і прадавалі расійскім прадпрымальнікам. Тавары афармляліся на фірмы ў краіне-суседцы, прыбытак збіраўся там жа, а кошт прадукцыі ў дакументах заніжаўся ў некалькі разоў.

Клубок незаконных схем разблыталі. Бюджэт недалічыўся звыш 925 тысяч рублёў падаткаў. Узбуджана крымінальная справа. Маёмасць падазроных, у тым ліку два аўтамабілі і пяць аб'ектаў нерухомасці, арыштаваныя.

З ранку і да вечара

Глыбоцкі раён. Кажуць, хто схлусіў раніцой, будзе хлусіць да вечара. Галоўны заатэхнік і загадчыкі фермаў сельскагаспадарчай арганізацыі напачатку прыпісалі каровам неіснуючыя «дасягненні»: у 2017 годзе надоі ўзраслі больш чым на 300 тон, у 2018-м – на 105. Потым, каб схаваць падман, у дакументах «абвінавацілі» цялят: маўляў, аказаліся вельмі прагнымі і выпілі за тры папярэднія гады звыш нормы каля адной тысячы тон малака на суму прыблізна 400 тысяч рублёў.

Але прыйшоў вечар... Для прадпрыемства хлусня каштавала амаль шэсць тысяч рублёў: аператары машыннага даення незаконна атрымалі зарплату, і ў дзяржаўны пазабюджэтны фонд сацыяльнай абароны насельніцтва былі пералічаны лішнія ўзносы. Палову сумы ўрону ўжо аплацілі, астатняе будзе вернута.

Крымінальнае спаборніцтва

Лідскі раён. Памятаеце анекдот: «Адкат – гэта грашовая ўзнагарода за выбар пэўнай фірмы, а тэндар – гэта чэмпіянат галіны па адкатах»? Згодна з ім начальнік аддзела мясцовага прамысловага прадпрыемства – кіраўнік зборнай па такім крымінальным спаборніцтве. Больш чым год ён дапамагаў прыватнай кампаніі і індывідуальнаму прадпрымальніку выйграваць працэдуры закупак і заключаць потым з яго арганізацыяй дагаворы на аказанне рэкламных паслуг. Апошнія практычна не рабіліся, затое шчодра аплачваліся: удзельнікі злачыннай схемы абнаявілі звыш 200 тысяч рублёў, пералічаных на рахункі падманшчыкаў.

Кар'ера «спартсменаў» скончылася прадказальна: ім пагражаюць турэмныя краты.



Па матэрыялах прэс-цэнтра Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь.



Дзе тонка – там і рвецца,
Дзе тоўста – там не гнецца.

* * *

Для шчасця чалавеку трэба мала:
Каб жыць жаданне раптам не прапала.

* * *

Каб жаданні з магчымасцямі супадалі,
Тады б людзі, не маючы крылаў, ляталі.

* * *

Для ўсіх, хто на свеце народзіцца,
Па́ра калісьці знаходзіцца.

* * *

Гарэлка для п'янтосаў,
Як куранятам – проса.

* * *

Не зыркай на чужое скоса,
Пільнуй, што маеш сам пад носам.

* * *

І маладым, і сталым
Належыць жыць у па́ры.

* * *

Калі не цягне цалавацца,
Час з маладосцю развітацца.

* * *

Калісь матуля мне сказала:
«Скупым заўсёды грошай мала».

* * *

Працуй, каб на вадзе і просе
Нам жыць з табой не давялося.

* * *

Вытрымаць могуць жаночыя кпіны
Толькі з вялікім каханнем мужчыны.

* * *

Калі няма ад п'яніцы спакою,
Заўжды трымай патэльню пад рукою.

Даслала Людміла ЮШЫНА,
г. Баранавічы.

Не вельмі

У блогераў сучасных, вер мне,
Нярэдка з моваю – не вельмі.
Не могуць падабраць адразу
Няўмекі граматную фразу.

Шукалі праўду

– А што з рукой тваёю, дружа?
– Учора з жонкаю сварыўся.
Мы праўды з ёй хацелі дужа!
Яна ў слязах, а я – у гіпсе...

Будні тамады

– Учора вяселле закончылі рана:
Нявесту адвезлі ў раддом нечакана.
– А ў нас дык было з маладым не такое:
Са свята уцёк на вяселле другое...

Закон прыроды

Алень мяняе рогі
Год ад году,
Мужчына ж найчасцей –
Пасля разводу.

Алесь КОРНЕЎ,
г. Баранавічы.

«Была зіма,



Уладзімір БАРАНОЎСКІ.

Анатоль ГАРМАЗА.

Леанард ЧУРКО.

Уладзімір ЧУГЛАЗАЎ.

Алег ГУЦОЛ.

былі Марозы!..»

Яўген ЦАРКОЎ.

Алег ПАПОЎ.

Анастасія СКАРКО.



Аляксандр КАРШАКЕВІЧ х 2.

Карыкатуры з архіва «Вожыка».



Сяброўскі шарж Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

Бачыць прыгожае і — вясёлае!

Вядомая беларуская паэтэса Ніна ГАЛІНОЎСКАЯ сёлета ў снежні адзначае прыгожую дату – 85-годдзе з дня нараджэння. За свой доўгі і плённы творчы шлях найбольшы ўнёсак Ніна Васільеўна зрабіла ў скарбонку айчыннай дзіцячай літаратуры. Моцна сябруе з «Вожыкам», з'яўляецца пастаянным аўтарам «Калючыка». І першую спробу пяра, будучы вучаніцай 5-га класа, ажыццявіла менавіта ў гумарыстычным жанры: складала прыпеўкі! А яшчэ – казкі, якія пераказвала таварышкам.

Тое было даўно, сёння Ніна Васільеўна – аўтар шматлікіх вершаваных зборнікаў для дзяцей. Знаходзіць агульную мову з самым патрабавальным чытачом ёй дапамагае ўласны педагагічны вопыт. Кожны твор – захапляльная вандроўка ў казачны свет дзяцінства, цікавы і нам, дарослым. Усе, хто ведае паэтэсу асабіста, як адзін сцвярджаюць: у яе самой варта павучыцца ўменню дзяліцца бязмежнай цеплынёй шчодрага сэрца, бачыць прыгожае ў навакольным свеце і людзях.

Жадаем Ніне Васільеўне перш за ўсё моцнага здароўя, а таксама бадзёрасці, аптымізму, творчага натхнення!

Ніна ГАЛІНОЎСКАЯ

Уверсе шум, уверсе звон –
Ляціць гігант, ляціць Дракон.
Яму насустрач Бармалей:
– У лес імчыш?
– Ага.
– Смялей!
Мы панясёмся так удвух.
Ад страху ў зайцаў выйдзе дух.
– Эх, пасмяёмся на ўвесь лес.
– У нас адзіны інтарэс.
Ляцяць драпежнікі са злом,
І зло іх ходзіць хадуном.
– Сягоння зайчыкам – капут!
Які цудоўны наш маршрут!
Ляцяць драпежнікі, ляцяць.
І злы азарт іх не суняць.
Ім вельмі хочацца ахвяр!
Ды раптам – аб сасну ўдар:
Драпежных асляпіла зло...
А зайкам весела было.

– Спусціся на зямлю, Жаўрук,
Найлепшы будзеш мой сябрук, –
Прасіў расчулена Індык.
– Пад небам я лятаць прывык.
Даўно знаёмы з вышынёй,
Спявае сонейка са мной.
І гэту песню чуюць людзі.
Без вышыні мне сумна будзе.
Ты не крыўдуй, Індык, прабач.
Жадаю поспехаў, удач...

– Хвалько! – Індык забалбатаў, –
Хоць я да неба не лятаў,
Але, як ты, змагу вісець,
На крылах хмаркі пасядзець.
Жаўрук гаворыць:
– Гэй, Індык,
Ты прыкусі крыху язык!..

Як ні напружваўся Індык –
З яго палёту выйшаў пшык.
І ён ад злосці аж прысеў,
Ураз, як рак, пачырванеў.
Такі гуляе і цяпер.
Калі не верыш, дык правер.

Размаўляюць дзве дзяўчынкі.
Вы паслухайце, пра што.
– Глянь, якія боты ў Зінкі!
І якое паліто!
– Нос кірпаты, вусны бантам,
Ногі – доўгія калы.
– Лічыцца экстравагантнай...
– А хвасты, як дзве мятлы!
Чуў размову дзвюх сяброўак
Аднакласнік Ігарок.
– Я скажу чатыры словы:
Вы – падобны да сарок.

Мог выдатнікам я стаць,
Каб задачы не рашаць.
Адмянілі хай бы толькі
Ненавісныя дыктоўкі.
Майстра спорту быў бы варты,
Каб займаўся больш упарта.
Злётаў бы на Марс улетку,
Каб не быў далёкім гэткім.
Быў бы смелым капітанам,
Каб былі тут акіяны.
Каб не крыўдзіў я малых –
Быў бы прыкладам для ўсіх.

Аўташарж.

«Карыкатурыст — прафесія не выміраючая, а рэдкая»

Такія словы можна пачуць ад Анатоля ГАРМАЗЫ, калі размова ідзе пра мастакоў-гумарыстаў. Маладыя спецыялісты лічаць карыкатуру лёгкім хлебам, і калі пачынаюць займацца гэтай справай, спадзяюцца на хуткі поспех. Але потым разумеюць, што развесяліць чалавека складаней, чым прымусіць заплакаць...

Анатоль Іванавіч Гармаза займаецца такой цяжкай, але вясёлай справай усё жыццё – а гэта 65 гадоў, з чым яго шчыра і віншуем! Карыкатуры мастака ведаюць ва ўсім свеце. Каб пералічыць краіны, у якіх друкаваліся яго вясёлыя малюнкі, не хопіць і гэтай старонкі. Анатоль прыйшоў у «Вожык» маладым хлопцам, пасля арміі, шмат чаму навучыўся, убачыў, зразумеў... Скончыў Мінскае мастацкае вучылішча імя А. К. Глебава, мастацка-графічны факультэт Віцебскага педагагічнага інстытута. Дарос да загадчыка мастацкага аддзела часопіса. І цяпер часта падкрэслівае, што ўдзячны «Вожыку» за «школу жыцця і творчасці».

Ужо шмат гадоў Анатоль Іванавіч займаецца выпускам розных выданняў – і для дарослых, і для дзяцей, з'яўляецца генеральным дырэктарам выдавецтва. Ён прыдумаў вядомую гумарыстычную газету «15 суток». Заўжды з радасцю сустракаецца з вожыкаўцамі на мерапрыемствах, друкуецца на старонках роднага часопіса.

Здароўя, доўгіх гадоў жыцця, поспехаў і новых вясёлых твораў жадаем табе, Анатоль Іванавіч!

Гумарыст з дзяцінства

Сяброўскі шарж Анатоля ГАРМАЗЫ.

Аляксандр ПЯТРОЎ з дзяцінства любіў гартаць часопісы «Кракадзіл», якія выпісвала яго бабуля. Бясконца пераглядаў пяцітомнік дацкага карыкатурыста Херлуфа Бідструпа. У школе маляваў вясёлыя коміксы і шаржы на аднакласнікаў... Словам, рос сапраўдным гумарыстам.

Пасля службы ў арміі Аляксандр паступіў у Мазырскі педагагічны інстытут імя Н. К. Крупскай, пачаў выкладаць у слуцкім цэнтры тэхнічнай творчасці (дзе, дарэчы, працуе і сёння). А ў 2012 годзе, пасля вучобы ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка, атрымаў спецыяльнасць псіхолага. Гэтая акалічнасць істотна паўплывала на змест ягоных работ.

Увогуле першую карыкатуру Аляксандр намаляваў у 1996 годзе, яна была надрукавана ў газеце «Пикник». Тады ж пачалося і супрацоўніцтва з часопісам «Вожык», дзе ў той час працавалі мастакі Яўген Царкоў, Іван Бокій... Аляксандр і цяпер ахвотна друкуецца на калючых старонках, яго творчасць займае адметнае месца сярод работ калег.

Паўвекавы ўзрост для мастака-карыкатурыста – гэта росквіт. Жадаем табе, Аляксандр Сяргеевіч, даўгалецця, вострага пяра і шчасця!





Да 110-годдзя Уладзіміра Корбана

25 жніўня 1910 года ў пасёлку Барань, што на Аршаншчыне, нарадзіўся вядомы беларускі паэт-сатырык Уладзімір Іванавіч КОРБАН. Першыя літаратурныя творы ён надрукаваў у 1945-м, а ўжо праз тры гады быў прыняты ў Саюз пісьменнікаў Беларусі. Амаль два дзесяцігоддзі Уладзімір Іванавіч працаваў у часопісе «Вожык», з іх у 1967–1971 гадах – галоўным рэдактарам. У 1970-м яму прысвоена ганаровае званне «Заслужаны дзеяч культуры». У час Вялікай Айчыннай вайны камандаваў стралковай ротай, удзельнічаў у баях за вызваленне Беларусі. Аўтар шматлікіх зборнікаў сатырычных вершаў, баек і фельетонаў (чатыры кнігі пабачылі свет у «Бібліятэцы «Вожыка» – «Дакладныя прыкметы» (1958), «Сіняк» (1964), «Дзям'янава юшка» (1970), «Жук і мёд» (1980)), зборнікаў гумарыстычных апавяданняў «Да цешчы на бліны» (1963), «Дзядзькава крыўда» (1982).

«Дакладныя прыкметы» сваіх герояў У. Корбан ведаў, як ніхто іншы. Пэўна, таму такой папулярнасцю карысталіся ў чытачоў яго байкі, якія і сёння гучаць, нібы толькі што напісаныя.

(Дарэчы, у 2010 годзе напрыканцы верасня на Аршаншчыне праходзілі юбілейныя мерапрыемствы, прысвечаныя 100-годдзю знакамітага байкапісца. Адбыліся сустрэчы з чытачамі Аршанскай раённай цэнтральнай бібліятэкі ў г. п. Бабінічы і аршанскай бібліятэкі імя Уладзіміра Корбана, у маляўнічым бараньскім сасновым парку прайшло тэатралізаванае гарадское свята «Наш славуты зямляк», а ў зале Палаца культуры – галоўная вечарына. Дзякуючы тагачаснаму старшыні гарвыканкама г. Барань Васілю Русакову ў скверы каля сярэдняй школы № 15, якая носіць імя У. І. Корбана, з нагоды стагадовага юбілею слыннага творцы была пасаджана новая алея, а таксама зроблены і адкрыты Памятны знак у гонар У. Корбана. Планавалася, што гэты камень у будучым стане падмуркам помніка слыннаму сатырыку.)

На радзіме па праве ганарацца славутым земляком. Таму сёлета было прынята рашэнне аб правядзенні адкрытага рэгіянальнага дыстанцыйнага конкурсу чытальнікаў баек «Талентаў у нас шмат!», прысвечанага 110-годдзю з дня нараджэння вядомага беларускага байкапісца Уладзіміра Корбана. Заснавальнікі і арганізатары мерапрыемства – Бараньскі гарвыканкам, аддзел культуры Аршанскага райвыканкама, ДУК «Палац культуры г. Барань Аршанскага раёна», ААТ «Тэхніка сувязі». Гэтую ідэю таксама ўхваліла рэдакцыя рэспубліканскага часопіса «Вожык» – найстарэйшага літаратурна-мастацкага выдання ў галіне сатыры і гумару. Галоўны рэдактар Юлія Зарэцкая прыняла прапанову ўзначаліць журы конкурсу. У яго склад таксама ўвайшлі Алена Чарных, дырэктар ДУ «Культурна-гістарычны комплекс «Залатое кола горада Віцебска «Дзвіна», рэжысёр; Вікторыя Бацюкова, рэдактар аддзела навін канала «Культура» Беларускага радыё, вядучая радыёперадачы «Тэатраманія»; Максім Перасецкі, акцёр тэатра і кіно; Аляксандр Дубкевіч, намеснік дырэктара па ідэалагічнай рабоце і кадрах ААТ «Тэхніка сувязі»; Жанна Кальчэўская, старшыня пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі ААТ «Тэхніка сувязі» Беларускага прафесійнага саюза работнікаў галін прамысловасці «Белпрафмаш».

Кожны, хто ведае, любіць і ўмее чытаць байкі У. Корбана, хто валодае артыстызмам, мог прыняць

Працяг на стар.10.

Фотаздымак аўтара.

Шарж Анатоля ВОЛКАВА, 1970 г.

Заканчэнне. Пачатак на стар. 9.

удзел у гэтым мерапрыемстве. Інфармацыя пра яго размяшчалася ў глабальнай сетцы інтэрнэт на афіцыйных старонках сацыяльных сетак арганізатараў конкурсу.

Спаборніцтва чытальнікаў праводзілася дыстанцыйна – у форме прагляду конкурсных відэаматэрыялаў. Кожны ўдзельнік рыхтаваў выступленне (чытанне байкі У. Корбана на памяць па ўласным выбары на беларускай мове) і адпраўляў на электронны адрас арганізатара. Заяўкі прымаліся з 1 жніўня па 1 кастрычніка 2020 года.

Конкурс праводзіўся ў наступных узроставых катэгорыях: малодшая (6–10 гадоў), сярэдняя (11–14 гадоў), старэйшая (15–35 гадоў) і дарослыя (35 гадоў і больш). Усяго было дапушчана 26 чытальнікаў.

У малодшай узроставай групе дыпламантам I ступені стала Марыя Аўсюкевіч, удзельніца ўзорнага юнацкага тэатра-студыі «Гармонія» ДУК «Полацкі гарадскі Палац культуры» г. Полацка (кіраўнік Святлана Аляксеева) з байкай «Тупіца і шкатулка», у сярэдняй узроставай групе – Арына Рубановіч з байкай «Казёл і муха», у старэйшай узроставай групе – Іван Байкоў з байкай «Агуркі», удзельнікі ўзорнага тэатра «Вясёлка» ДУК «Палац культуры г. Барань Аршанскага раёна» (кіраўнік Людміла Сасніцкая). Сярод дарослых чытальнікаў перамогу атрымала Людміла Ярома, удзельніца клуба самадзейных паэтаў «Натхненне» ДУК «Палац культуры г. Барань Аршанскага раёна» (кіраўнік Аксана Васілёнак) з байкай «Пустышка». Дыпломы і памятныя падарункі пераможцам былі ўручаны 23 кастрычніка падчас святкавання Дня горада Барань.

Конкурс актыўна падтрымалі прыхільнікі і аматары беларускага мастацкага слова, што садзейнічала развіццю творчых здольнасцей дзяцей, моладзі і дарослых, стала значным укладам у захаванне памяці і літаратурнай спадчыны Уладзіміра Корбана.

Убачыць і паслухаць выступленні пераможцаў адкрытага рэгіянальнага дыстанцыйнага конкурсу чытальнікаў баек «Талентаў у нас шмат!» можна па спасылках https://vk.com/dk_baran, https://ok.ru/group/54131903496386 альбо на сайце часопіса сатыры і гумару «Вожык».

Людміла САСНІЦКАЯ,
загадчык дзіцячага аддзела Палаца культуры г. Барань.

Аляксандр КАРШАКЕВІЧ.

Мікола ГІРГЕЛЬ.

Алег ГУЦОЛ х 2.

Незвычайная зіма

На Палессі зноў зіма
Незвычайнай долі.
Студзень месяц, а няма
Ні сняжынкі ў полі.

І марозік не бярэ,
Як раней, за вушы.
Мо на штосьці захварэў
Ці на поўнач рушыў?

Сее дожджык без пары,
На падворку золка.
Часам нават угары
Бачыцца вясёлка.

Завялі чмяля ў падман
Цеплыня ды ціша,
Праляцеў ён, як жакан,
Над самотай вішань.

Носіць былкі для гнязда
На вярбу сарока,
Хоць сапраўдная вясна
Недзе шчэ далёка...

Фёдар ЛАПАНІК,
г. Ляхавічы.

Стылістычныя выбрыкі

● Яшчэ адным плюсікам на карысць гэтага спакуслівага сцвярджэння шахматыстаў стала новая чорна-белая традыцыя.

● Слухала аповед сваёй 13-гадовай перабабулі.

● Фарумчане (удзельнікі форуму) наведалі завод.

● Дзяўчына ўсёй душой рвалася дадому, але лёс яе не песціў: паехала ў Падмаскоўе і там сустрэла будучага мужа.

● Змаглі дакрануцца да сэрцаў.

● Вялікую дапамогу бяздомным чацвераногім гараджанам аказваюць італьянцы.

● У гарачы настрой гледачоў артысты падкінулі яшчэ больш музычных дроў.

● Наведвальнікаў частавалі порцыяй гумару.

● Ад радасці на вушах стаяў увесь пасёлак.

● І на такой пазітыўнай ноце аўтобус паехаў у вёску.

● Мінулай восенню з Мазыра прыбыў 6-гадовы самец.

● Свята прайшло па ўсіх традыцыях жанру: ярка, звонка, сытна.

● На сцежку барацьбы сталі дзве каманды сапернікаў.

● Атрымала падарункі ад свайго галоўнага мужчыны.

(З газет).

Выпісаў Міхась СЛІВА,
г. Рагачоў.

Лёля БАГДАНОВІЧ

Пра Снягурку, сваты і пяты

Лупцуе дождж без перапынку,
Снягурка плача ноч і дзень.
Сасватаў Вадзянік дзяўчынку –
Нязвыкла беднай у вадзе...

– За што, агідная пачвара,
Ў балота гэткую красу?!
Табе Кікімара да па́ры!
Глядзі, бо будзе самасуд!

Пакінь нядобрую задуму:
Ў чужую лезеш ты кішэнь.
Няўжо не разумееш, дурань,
Што ты стары, трухлявы пень?!

Тут Дзед Мароз махнуў кіёчкам –
І паляцеў сняжынак рой.
Махнуў яшчэ адзін разочак –
Прыкметна пацішэў «герой».

Забыўся нават і пра сваты –
Нібы жарэбчык малады,
Пабег, аж заблішчалі пяты,
І знік у багне назаўжды.

г. Барысаў.



Васіль ТКАЧОЎ

Дзед Ахрэм і баба Поля чакалі ўнука Петрыка. Яны жывуць у вёсцы, а той – гараджанін. Патэлефанаваў надоечы, што едзе на ўсе зімовыя канікулы. Так і заявіў: «Будзем святкаваць Новы год разам! Ура-а-а!»

Старыя, вядома ж, узрадаваліся, а дзед нават прапанаваў сустрэць унука сюрпрызам. Хітравата паглядзеў на жонку і сказаў:

З Новым

Мікола ПРГЕЛЬ.

– Заўтра раненька, пакуль ніхто не бачыць, злепім снегавіка. Даеш згоду?

Баба Поля заўпарцілася:

– Здзяцініўся, ці што? Ляпіць снегавікоў і снежных баб – у нашым узросце? Людзі засмяюць, стары дурань!

Дзед міралюбіва гыркнуў:

– Дык я ж і кажу, бязмозглая твая галава, – раненька. Пакуль усе спяць. Заадно і маладыя гады ўспомнім. Унук заявіцца, а ў нас на двары яму сюрпрыз падрыхтаваны. Во радасці будзе малому! Дык я і пытаю: даеш згоду?

– Даю, – пагадзілася тая, бо ведала, што з гаспадаром, калі ён што задумаў, спрачацца дарэмна.

Снегавіка зляпілі прыцемкам. Для носа баба Поля прынесла з клеці вялікую морквіну, а для вачэй дзед Ахрэм вырашыў скарыстаць кішміш. Некалі ён служыў салдатам ва Узбекістане, а там гэтых ягад – мора, толькі еш! Калі вярнуўся ў свае Паплавы пасля войска, пасадзіў каля адрыны некалькі кустоў вінаграду. Даў сабе такое слова ў арміі. З таго часу кішмішу ў яго хапала.

Як толькі развіднела, у хату да старых завітаў сусед. Ледзь пераступіўшы парог, запытаў:

– Што, унук Петрык ужо прыехаў? Бачу, снегавік на двары.

Дзед Ахрэм і баба Поля моўчкі пераглянуліся: як быць, што адказаць? Паколькі хлусіць не ўмелі, то адразу ва ўсім прызналіся.

Сусед, чаго старыя не чакалі, пахваліў іх і нават падзякаваў за добры прыклад, заявіў:

Годам!

Алег ПАПОЎ.

Пётр КОЗІЧ.

– А гэта ідэя! Пайду я дахаты і такім жа чынам свайго ўнука сустрэну. Таксама чакаю. Зляплю што-небудзь...

Адыходзячы, заўважыў:

– Толькі, гляджу, вочы вы запамяталі снегавіку зрабіць.

– Як гэта забыліся?! – здзівіўся дзед Ахрэм. – Нічога не забыліся!

Ён, спехам ускінуўшы кажух на плечы, падаўся на вуліцу да снегавіка. Сапраўды, вачэй не было.

– Я ж сам яму кішміш уторкнуў. Сваімі рукамі, – разгублена тлумачыў суседу, што выйшаў з хаты за ім. – Самы большы выбраў. Верыш? І куды ж тыя вочы падзеліся? Дзівосы, аднак.

Стары хуценька выправіў гэтую недарэчнасць. Сеў у хаце каля акна і задумаўся: цікава, дзе падзеўся вінаград? Укралі? Тады хто ж рабаўнік? Калі адзін раз спакусіўся, спакусіцца і другі. Кішміш жа – смаката. Значыць, трэба пільнаваць...

І высачыў! Неўзабаве да снегавіка падляцела варона, хуценька склявала ягады і адляцела. Села на галінку яблыні, агледзелася па баках і, пачасаўшы дзюбу аб пер'е, задаволена каркнула.

– Я табе зараз пакажу, дзе ракі зімуюць! – мужчына схапіў стрэльбу, якую даўно не браў у рукі, і выбег на падворак. – Дзе яна тут? Ага, уцякаць? – і ён нацэліў ствол ружжа на птушку.

Варона, убачыўшы паляўнічага, вокамгненна схавалася за хату. «Адчувае, халера ясная, віну. Бач ты яе, драпнула!..» – дзед Ахрэм уздыхнуў і зноў пайшоў у хату па вінаград...

І на гэты раз кішміш дастаўся вароне. Стары не на жарты ўзлаваўся і пабажыўся застрэліць яе, чаго б яму ні каштавала. Гэтак, дальбог, і здарылася, калі б у яго меўся хоць адзін патрон. А так толькі накрычаўся ды папалохаў птушку.

Што цікава: калі выйшаў на падворак без стрэльбы, варона не ўцякала. Толькі ступіў на ганак з ружжом – пуста! Ён нават паўтарыў для эксперыменту свае выхады некалькі разоў. Той жа вынік!

– Хто мне цяпер скажа, што варона дурная?! – абурана прамовіў дзед. – Давядзецца здацца. Нясі, Поля, вугельчыкі. Будзем снегавіку вочы рабіць. А вароне жменю кішмішу вынось. Пачастуем яе. Усё ж свята надыходзіць – Новы год. Хай і яна парадуецца, ліхадзейка. Бачу, дужа спадабаўся ёй наш вінаград. І каб я больш не чуў пра сябе: дурны, як варона! Прыдумай іншую абразу. Гэтая не падыходзіць. Адпадае...

Для ўнука Петрыка снегавік стаў сапраўдным сюрпрызам.

– Я потым яшчэ аднаго зляплю, – паабяцаў хлопчык. – Удвух ім весялей будзе. Вось толькі паабедаю.

Дзед Ахрэм прытуліў унука да сябе, а вароне, якая сядзела на яблыні, прыгразіў, блазнуючы, пальцам:

– Глядзі там у мяне! Каб без фокусаў!

Хоць якія могуць быць трукі, калі вочы ў снегавіка не з кішмішу, а з вугельчыкаў?

Але ж перад Новым годам – майце на ўвазе! – могуць здарацца і не такія сюрпрызы...

г. Гомель.

Наватодні «хапун»

Нібыта згаладнеў народ!
Глядзіце: з крам пад Новы год
Скупаюць тонамі прадукты...
І мяса ў ход ідзе, і фрукты!
І звычай гэты не загіне:
Вось цягне хтось гарэлкі скрыню,
Каўбас вязанку, мандарынаў,
Хурмы, бананаў, апельсінаў
І памідораў, агуркоў...
Да свята ўсё! Усё – дамоў!
Я запытаць хачу: «Народ,
Ты закупаешся на год?»
Ды адказаць бракуе часу:
Не ўсе набытыя каўбасы...

Сяргей ЧЫГРЫН,
г. Слонім.

Пра бюлетэнь і выхадны дзень

Праспаў на працу... Каравул!
Урэшце свеціць мне прагул.
Раней маніў і выдумляў:
Нібыта цешчу «пахаваў»,
І кроў здаваў разоў ўжо пяць...
Даведкі болей не дастаць!
І праўда, справы мае дрэнь,
Кроў з носа – трэба бюлетэнь.
Хоць і здаровы я, як дуб,
Але прыдумаў. Вырву зуб!
Перад хірургам завываю:
– Хутчэй цягніце, ледзь трываю!
Быў доктар не са слабакоў –
Рвануў, што я ажно зароў.
Зрабіўся ноччу белы дзень...
Мычу: «Давайце бюлетэнь!»
Хірург глядзіць сумленна ў вочы:
«Дык дзень жа сёння нерабочы...»
З-за дурасці – аж свет не люб! –
Ахвяраваў здаровы зуб.

Любоў ЧЫГРЫНАВА,
г. Мінск.

Пётр КОЗІЧ.

Патраціла без суму
Агромністую суму.
Куды? Не ведаю сама:
Нібы купіла я сама...

* * *

Вы падкажыце, як мне быць?
Ў амурных справах – як той лапаць:
Не ўмею я дзяўчат любіць,
А навучыўся толькі лапаць.

* * *

Ізноў на экране рэклама стракоча,
Чарговая гандлю агітка.
Спакойна ўспрымаць яе розум не хоча:
Страката, прыгожа... А гідка.

Анатоль ПАЛЫНСКІ,
г. Беразіно.

Ігар ПРАКАПОВІЧ

Было гэта пры першых Саветах. Тады якраз пачалі зганяць сялян у калгасы. Казалі, што дзеля таго, каб жыць было лягчэй, а на самай справе...

Завітаў у засценак ўпаўнаважаны – пыхлівы, франтавата апрануты «начальнік». Людзей сабралі ў самай вялікай хаце. Той і пачаў вучыць вяскоўцаў, як садзіць, сеяць, араць, капаць...

Слухалі яго мужчыны, усміхаліся ціха ў вусы ды бароды, ківалі галовамі ці то ў знак згоды, ці то каб не заснуць. А ўпаўнаважаны, зразумеўшы тое качанне мужыцкіх галоў як адабрэнне, натхняўся ўсё больш і больш. Апагей ягонай пафаснай прамовы прыйшоўся на ўгнаенні.

– Товарищи крестьяне, – узрушана звярнуўся ён да мужчын, – самый лучший навоз – это куриный помёт. Поэтому, дорогие товарищи, главная задача нынешнего момента – это собрать как можно больше куриного помёта и угноить поля.

Відаць, каб завязаць жывую дыскусію, ён звярнуўся да Гіляра – мужчыны сярэдняга веку, які сядзеў перад ім.

– А скажите, товарищ, какую площадь может удобрить одна курица?

Гіляр – чалавек на выгляд вельмі спакойны і сур'ёзны – быў на самай справе вялікім жартаўніком. Ён разважліва пачухаў патыліцу і няспешна адказаў:

– Лічу, што, пэўна, з гактар зможа ўгноіць.

– Сколько курей имеешь?

– Васямнаццаць.

– А земли?

– Васямнаццаць гактараў.

– Вот видишь, товарищ, ты своими курями можешь удобрить всю свою землю!

Мужчыны, якія слухалі гутарку, ледзь стрымліваючы смех, пасля апошніх слоў упаўнаважанага выбухнулі дружным рогатам.

«Начальнік» спачатку пачырванеў ад няёмкасці, а потым пабялеў ад злосці – зразумеў, што яго падкузьмілі. Але, як вопытны палітбаец, пазіцый не пакінуў.

Калі рогат крыху суняўся, з мужыцкай грамады падняўся Ігнат, першы спец на вёсцы на розныя штукі:

– Вось вы, шаноўны начальнік, кажаце, што дужа добрае курынае га..., прашу прабачэння, памёт. А мой жа дзед казаў, што найбольшую карысць зямлі дае мача жаробнай кабылы. Я ўжо назбіраў тры вядры...

Пра што казаў Ігнат далей, дакладна невядома, бо хата застагнала ад смеху. А ўпаўнаважаны выскачыў за парог і, сеўшы на каня, рвануў у райцэнтр...

Здарылася тое даўно, адразу пасля вайны. Прыехаў у вёску фінагент людзей на пазыку падпісваць. А засценак пры лесе стаяў, дзе «лясныя браты» хаваліся.

Ідзе фінагент па вуліцы: скуранка, капялюшык, сумачка пад пахаю. Насустрач яму – стары Падгайскі. Дзеду тады гадоў пад семдзесят было: высокі, цыбаты, у доўгім паношаным польскім плашчы, падпяразаны салдацкім рэменем з кукардай, у добра-такі падраных ботах...

Вось яны сышліся, параўняліся. Павіталіся. Агент прыкінуў, што стары – чалавек бясшкодны, лаўтух, ды і ўзяўся яго ўгаворваць падпісацца на пазыку.

Падгайскі стаяў, слухаў, моршчыў твар (звычка ў яго такая была), а потым паволі пачаў адхінаць рукой левае крысо доўгага плашча. Прыезджы заўважыў рух, зірнуў і – адразу анямеў. Дзедава рука гэтак жа павольна расшпільвала раменьчык пісталетнай кабуры, якая вісела на пасе пад плашчом.

Нямая сцэна доўжылася імгненне. Агент выпусціў з рук сумачку, развярнуўся ды што моцы кінуўся бегчы.

З-пад яго ног разляталіся то жвір, то гразь з лужын.

– Гэй, чаго спужаўся? – пачуўся ззаду голас старога. – Я ж толькі прыкурыць хацеў.

Мужчына спыніўся. Азірнуўся.

Падгайскі дастаў з кабуры люльку, набіў яе табакай і, смачна закурыўшы, пусціў у паветра духмяныя кольцы дыму...

г. Паставы.

Леў КАЗЛОЎ

Мяшчанка-ўдава заказала літургію ў царкве і заплаціла ўсяго паўгроша. Святар стаў за аналоем, але службу не пачынаў, толькі гартаў і гартаў Евангелле, быццам нешта шукаючы. Была зіма, ужо і ногі ў кабеты пачалі мерзнуць, а каля алтара панавала цішыня.

Нарэшце заказчыца не вытрымала і спытала, у чым справа. «Ды вось ніяк не магу знайсці тое месца ў кнізе, якое служыцца за паўгроша», – патлумачыў клірык. І давялося эканомнай удаве патроіць суму.

* * *

Неяк адзін заможны шляхціц прыбыў у рэзідэнцыю літоўскага канцлера з намерам прасіць у князя пратэкцыю, каб заняць месца земскага суддзі. Канцлер ужо добра ведаў, хто ён і што сабой уяўляе, але нічога не паказваў наперад.

Выслухаўшы працяглае казанне прэтэндэнта на пасаду, Чартарыйскі, падышоўшы да секрэтэра, дастаў адтуль сапсаваны гадзіннік і працягнуў яго шляхціцу. Той здзіўлена паглядаў на князя, не разумеючы, для чаго ўсё гэта.

– Бярыце, бярыце, – заспакоіў вялікі канцлер прасіцеля. – Хацеў бы, каб пан яго ўласнаручна адрамантаваў.

– Але ж я ніколі гэтым не займаўся! – зусім разгубіўся той.

– Можа, пан авалодае прафесіяй і ўсё ж зробіць...

– Ратуй Божа, ніколі не навучуся!

– Ну, што ж, усё зразумела, – сказаў князь, адносячы гадзіннік назад, – з гэтай самай прычыны не станеце і суддзёю.

* * *

Староста і бурмістр жылі ў добрай згодзе. Нават мелі адно супольнае адзенне для свят ці ўрачыстых цырыманіялаў, якое апраналі па чарзе. Але аднойчы староста па нейкай прычыне не перадаў боты з гэтага афіцыйнага камплекта, і бурмістр, атрымаўшы запрашэнне на сустрэчу з каралём, які праязджаў праз іх горад, вымушаны быў прасядзець дома. І гэта абразіла яго да глыбіні душы.

Прайшло некалькі дзён. Пану старосту трэба было пакараць неяк злачынца, якога суд прыгаварыў да павешання. Па саму шыбеніцу даводзілася звяртацца да таго ж бурмістра. І дзяржаўца мясцовых зямель як нічога і не было накіраваў просьбу ў магістрат. На гэта галава горада адказаў так: «Шыбеніцу не дам, бо, калі і маю яе, то выключна для сябе асабіста і для сваіх блізкіх».

* * *

Па старым звычаі кароль і вялікі князь Жыгімонт час ад часу наведваў Літву, дзе цешыў сябе паляваннем. Асабліва любіў ён назіраць за тым, як сабакі змагаюцца з мядзведзем.

Аднойчы падчас такой сцэны пан Халецкі, староста чаркаскі, які стаяў каля яго вялікасці, здзівіўся, што сабакі чамусьці без асаблівага жадання ідуць на звера.

– Відаць, іх абкармілі перад гэтым, – выказаў меркаванне кароль, – таму і не бяруць яго.

– Тады, найяснейшы пане, – параіў староста, – пусці на мядзведзя сваіх пісараў, бо як яны ні аб'ядаюцца, а ўсё бяруць і бяруць.

* * *

У аднаго селяніна здохла карова, а крыху пазней памерла жонка. Сядзіць ён пасля ўсяго гэтага ў роспачы, не ведае, як жыць далей. Пачалі падыходзіць да яго суседзі і суцяшаць.

– Ці ж у нас дзяўчат бракуе, што застанешся ўдаўцом адзінокім? – кажа адзін. – У Пятра тры дачкі, выбірай, якую хочаш. Васілёва сястра на выданні...

– Мо хочаш, удаву табе пашукаем, – прапануе другі.

Той слухае, слухае ды адзываецца:

– Вельмі вам удзячны за вашыя парады. Але бачу, лепей страціць жонку, чым карову. Бо на месца нябожчыцы падсоўваеце мне капу дзяўчат, а вось каб хоць адзін прапанаваў жывёліну!

* * *

Ёсць старажытная ўсходняя прымаўка: «Сустракаюцца стагадовыя сяляне, не сустрэнеш стагадовага чыноўніка». Такое, відаць, здаралася і ў нас.

Кароль і вялікі князь Аляксандр Ягайлавіч паехаў на паляванне ў Налібоцкую пушчу і сустрэў там лесніка, якому, як казалі, было ўжо даўно за сто, але выглядаў ён даволі маладжава.

– Ці наведвала цябе хвароба? – спытаў старога Аляксандр.

– Не, найяснейшы пане. Хвароба не гасціла ў мяне, бо я не меў чым яе частаваць, – адказаў ляснік.

* * *

Стары дваранін, з тых, што служылі яшчэ пры Жыгімонту Аўгусту, цяжка захварэў. Лекары, якія абследавалі яго, безнадзейна махнулі рукой, што ўсе зразумелі як блізкі канец. Паколькі сваякоў у вяльможы не было, то некалькі знаёмых дваран, а за імі і слуг кінуліся ў пакой хворага, каб прыхапіць нешта каштоўнае з маёмасці. У імгненне вока ўсё было разрабавана. Засталіся толькі дзве жывёлінкі, якія неяк суцяшалі адзінокага саноўніка на сконе жыцця: маленькая малпа ды сабачка.

Раптам малпа, быццам нагледзеўшыся на людзей, што паспешна хапалі рэчы, выцягнула з-пад галавы свайго гаспадара падушку і пабегла з ёю ў куток. Сабачка кінуўся ўслед з шалёным брэхам і пачаў цягнуць тую падушку да сябе.

Ад гэтага вэрхалу і тузаніны дваранін ачуўся і, угледзеўшы прычыну, рассмяяўся: «О, Божа! І яны б'юцца за маю спадчыну». Ад гэтага смеху стала лягчэй, а праз некалькі дзён ён зусім ачуняў.

* * *

Сярод розных спосабаў здабываць «неапалітанскія сумы» ў каралевы Боны быў і такі, як продаж службовых пасад – і свецкіх, і духоўных. Калі стала вядома, што каралева-ўдава збіраецца туды, адкуль прыехала, ды яшчэ разам з такімі каштоўнасцямі, сенат прапанаваў затрымаць яе.



Для перагавораў з манархіняй паслалі біскупа Зэбжыдоўскага, аднаго з былых фаварытаў Боны, бо той таксама скарыстаў магчымасць і набыў сваё месца пад сонцам у яе вялікасці. Але зараз сітуацыя была зусім іншай, таму Зэбжыдоўскі пачаў даволі ультыматыўна. Тут старая каралева не вытрымала і гнеўна абарвала яго:

– І гэта кажаш ты, які купіў з майго дазволу біскупскі сан!

– Што зробіш, – уздыхнуў пасланец сената, – купіў, бо прадавалася...

«З дазволу караля і вялікага князя», Мн., 2016 г.

Міхась СЛІВА

Да Новага года заставалася яшчэ гадзіны тры, а кампанія, што сядзела за сталом – блізкія сябры гаспадара і суседзі, усе з жонкамі – была ўжо «цёпленькая».

У сяброў існавала завядзёнка: кожнае навагодняе свята яны адзначалі ў новым месцы. На гэты раз чарга прымаць гасцей выпала Дзянісу. Ён быў чалавек не скупы, а жонка Наташа – вельмі гасцінная, надзвычай любіла частаваць. Нават калі хто трапіць да іх у кватэру ў звычайны дзень, і то не адпусціць, пакуль не накорміць фірменнымі піражкамі. А тут такая падзея – Новы год!

Раптам у дзверы пазванілі. Дзяніс кінуўся адчыняць. На парозе стаялі Дзед Мароз і Снягурачка.

– А мы не заказвалі... – здзівіўся гаспадар. Да дзвярэй падбегла Наташа:

– Заходзьце, заходзьце, дарагія госцейкі!

Госць паставіў у парозе вялізную торбу. Муж з жонкай пераглянуліся і пачалі складваць гасцінец.

Пакуль Дзед Мароз гаварыў віншавальнае слова, Снягурачка моўчкі ўладкавалася за сталом.

Дзянісу падаўся нейкім знаёмым яе твар. «Дзе ж я мог бачыць гэтую дзяўчыну? – разважаў ён. – Але ж так нафарбавалася, што цяжка разабраць, дый адварочваецца...»

Дзед Мароз тым часам выпіў з гасцямі чарку, узяў пакет з гасцінцамі і пачаў збірацца.

– Не забудзьцеся ж сваю торбу! – замітусілася гаспадыня.

– І ўнучку! – дадаў нехта з вясёлых гасцей.

Госця ў гэты час смачна закусвала. Дзед Мароз яшчэ раз падзякаваў і знік у дзвярах...

Усе са здзіўленнем утаропіліся на Снягурачку, якая працягвала дэгуставаць стравы і загадкава ўсміхацца. За сталом стала ціха.

«Няўжо застанецца з намі? – відаць, падумаў кожны з іх. – Што ж будзе рабіць гаспадар?»

Выручыла гаспадыня. Загадала напоўніць фужэры з чаркамі ды пранавала тост за госцю:

– Гэта ж незвычайная Снягурачка! У мяне адразу, як яна зайшла, сэрца ёкнула. Потым прыгледзелася да яе, да сумкі... Хіба ты, Дзяніс, нічога не заўважыў?

Той падхапіўся, пачаў пільна ўзірацца. Ого, дык гэта ж іхняя сумка! Апошні раз, калі былі ў гасцях у цешчы, пакінулі...

Дзяніс падскочыў да Снягурачкі.

– Што, зяцёк, родную цешчу не пазнаеш? – весела рассмяялася тая. – Я ж вам гасцінцаў прывезла! – і ўзялася даставаць з сумкі розныя пакункі.

– А Дзед Мароз хто такі? – ажыўлена загаманілі госці.

– Дык гэта ж мой сусед! Ехаў да сына, дык і мяне захапіў. Касцюмы сяброўка дала, яна ў нашым клубе працуе. Там сёлета новыя купілі, а гэтыя без справы ляжалі...

– Перадавайце ёй дзякуй! Такі нечаканы сюрпрыз атрымаўся!

– І смачны! – нарэшце прамовіў зяць. У адной руцэ ён трымаў кавалак кумпяка, у другой – вэнджаную каўбасу і задаволена ўсміхаўся.

г. Рагачоў.

Мікола ГІРГЕЛЬ х 2.

Аляксандр БУЛАЙ.

Аляксандр КАРШАКЕВІЧ.

Кацярына АКУЛІЧ і Андрэй СІДАРЭЙКА.



Вера АСТАХНОВІЧ.

Вікенцій ПУЗАНКЕВІЧ і Аляксандр КАРШАКЕВІЧ.

Васіль ДЗЕРАВЯШКА



Дзіка пад дубам маладым
Паяльнай лямпаю смалілі.
І паляўчыя над ім
Жывёльны свет лясоў хвалілі.

«Дзічына – клас! Мы заўтра зноў
Удала ўволю папалюем.
Сярод аленяў і дзікоў
І адпачнём, і пабалюем».

На водар смалі, па слядах
Прыйшоў да дуба егер жвавы:
Збіраўся пратакол складаць
На браканьерскія забавы.

Віно лілося. Віўся дым.
Слабелі ветры і марозы.
І быў пад дубам маладым
Адзіны дзік ушчэнт цвярозы.

г. Бялынічы.

Кацярына АКУЛІЧ і Аляксандр КАРШАКЕВІЧ.

Па гарызанталі:

2. Мандарыны пайшлі ў ... – значыць, хутка Новы год *(сучасная прыказка)*. **3.** Самы модны навагодні танец. **8.** Ніхто не хоча сесці на яго падчас наведвання катка. **11.** Жаданы і рэдкі зімні госць, які нагадвае пра лета. **12.** Гасцей звычайна просяць не стаяць на ім. **13.** ... багаты, што бык рагаты *(прыказка)*. **14.** Калючы дружа. **19.** Лепшы святочны бізнес. **20.** «Целаахоўнік» лясных дрэў. **21.** Удзячная аўдыторыя тэлевізійных «Блакітных агеньчыкаў». **23.** «Каля ёлкі карагоды, // Песні, ... жывая, // А той дзед белабароды // Толькі ў вусы смех пускае» *(з верша Якуба Коласа)*. **24.** У старога быка ... глыбейшая *(прыказка)*. **25.** «У жыцці мужчыны бываюць ... перыяды: калі ён верыць у Дзеда Мароза, калі не верыць і калі ён сам Дзед Мароз» *(анекдот)*.

Па вертыкалі:

1. Спадарожнік кубачка. **4.** Лётчык, які з небам на «ты». **5.** Маленькі барадаты чалавечак з беларускіх казак, які жыве пад зямлёй. **6.** «Архаічны» сюрпрыз. **7.** Ролікі для льду. **9.** Як ... языком злізала. **10.** Скарб пасажыраў. **15.** Сабачы ... **16.** Смеласць – не яго канёк. **17.** Для быка рогі не ... *(прыказка)*. **18.** Смаляная пастка для насякомых. **22.** ... без страху і папроку.

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,
г. Дзяржынск.

ПАЭТЫ НЕ ПАМІРАЮЦЬ

З Дзмітрыем ПЯТРОВІЧАМ мы пазнаёміліся на свяце паэзіі ў Вязынцы гадоў пятнаццаць таму. Ён тады пачынаў уваходзіць у літаратуру першымі публікацыямі ў газетах і часопісах. Ляцеў час – і талент Дзмітрыя сталеў, набываў вагу.

Калі напачатку 2015 года ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» ўзнікла патрэба ў рэдактары, я звярнуўся да Дзмітрыя з прапановай перайсці з газеты «Звязда» да нас. І ён прыйшоў. У нас адразу ж знікла праблема: «Каму даць рукапіс, над якім трэба добра папрацаваць?» Дзмітрый Леанідавіч быў шчырым прафесіяналам. Дзякуючы яму пабачылі свет дзясяткі кніг. З ім было добра. Ён з павагай ставіўся да сваіх аўтараў, і аўтары любілі яго. Амаль усе выдавецкія прэзентацыі новых кніг адбываліся з Дзмітрыем Пятровічам. Паэт прыходзіў з гітарай. Іграў, спяваў, чытаў вершы, пародыі... Яго любілі нашыя чытачы. Гэта было бачна на кніжных выставах, калі каля Пятровіча збіраліся людзі, каб атрымаць ад яго аўтограф.

З Дзмітрыем мы землякі. Ад яго Заслаўя да маіх Пугачоў кіламетраў 30–35. У маладзечанскім накірунку ў Дзімы і яго маці Вольгі Міхайлаўны было лецішча. Пасля выхадных, прыходзячы на працу, ён нярэдка казаў: «З тваіх Пугачоў зноў не прапусцілі хмары, і нам давялося самім паліваць агарод. Будзеш у вёсцы – папрасі там, каб хоць зрэдку прапускалі да нас дождж».

Дзіма быў кампанейскім. Ён разумеў жарты і сам жартаваў. На працягу гадоў пяці ў працоўныя перапынкі мы з ім час ад часу прыдумлялі працяг бясконцай жартаўлівай гісторыі пра падводную лодку, якая ляжыць на дне Свіслачы каля Траецкага прадмесця. Я на той лодцы быў адміралам падводнага флоту і там часта начаваў. Пятровіч служыў боцманам. Прыдумлялі і смяяліся, часам да слёз. Нас слухала Наталля Філіповіч, якая сядзела ў адным кабінеце з Пятровічам. І яна смяялася, аж заходзілася. Шкада, што не запісвалі. Атрымаўся б цікавы прыгодніцка-фантастычны твор.

Дзмітрыю Пятровічу было 49. У наступным годзе ён збіраўся адзначыць сваё пяцідзесяцігоддзе. Рыхтаваўся. Пісаў новыя вершы, апавяданні, песні, меў шмат задум. Шмат чаго засталося незавершным.

Ён вельмі-вельмі любіў сваю маму. І часам здавалася, што жыў апошнімі гадамі дзеля яе. 24 лістапада ад каронавірусу памерла Дзімава маці Вольга Міхайлаўна, а вечарам гэтага ж дня памёр і сам паэт ад гэтай жа сусветнай заразы...

Творчыя людзі нават памёршы не паміраюць. Не памёр і Дзмітрый Пятровіч. Ён будзе жыць сярод нас сваімі творамі, якія напоўнены любоўю да роднай зямлі і людзей.

Віктар ШНІП.

ПАМЯЦІ ДЗМІТРЫЯ ПЯТРОВІЧА

Невымерны адчай і сумота,
Бо цябе не магу прывітаць.
Ты пайшоў пад асеннюю слоту
Сцежку шчасця між зорак шукаць.

Аддаваў ты душу трапяткую
Родным, блізкім сваім і сябрам.
Дзе ж уцеху знайсці хоць якую?..
Ты пайшоў у Нябесны свой Храм.

Ты пайшоў, каб вяртацца з-за хмараў
Песняй, вершам калі-нікалі...
Што ж, бывай, любы дружа-таварыш!
Ты пакінуў свой след на зямлі.

25 лістапада 2020 года

Мікола ШАБОВІЧ.

Калі згадваеш Дзмітрыя ПЯТРОВІЧА, абавязкова ўяўляеш яго з усмешкай на вуснах. Здаецца, ніводная сустрэча ў «Вожыку», выступленне ці прэзентацыя не абыходзіліся без жартаў. Смех Дзмітрыя быў шчыры, прыязны, добры, мяккі – як і ён сам. Павага да людзей, прыстойнасць, выхаванасць, такт, інтэлегентнасць адразу заўважаліся ў паводзінах і абліччы Дзмітрыя Леанідавіча. Безумоўны лірык, тонкая чулая душа, паэт заўсёды быў як на далоні, не ўмеў падманваць, крывадушнічаць, паддобрывацца.

Вельмі горка, што Дзмітрый Пятровіч так рана пайшоў ад нас, што больш не пачуць ні ягоных жартаў, ні шчырых прызнанняў, ні песень. Але мы будзем памятаць яго ўсмешку на вуснах...

Вожыкаўцы.

Рэдакцыя і рэдкалегія часопіса «Вожык» смуткуюць з прычыны смерці пісьменніка Дзмітрыя Леанідавіча ПЯТРОВІЧА і выказваюць шчырыя спачуванні родным і блізкім.

Генадзь АЎЛАСЕНКА

ТАКІЯ НЕЗВЫЧАЙНЫЯ ПРАФЕСІІ

Існуе заканамернасць: чым багацейшая краіна, тым больш у ёй самых розных прафесій, часам вельмі і вельмі незвычайных.

Хто з нас не марыў хоць на нейкі час адчуць сябе кімсьці іншым, атрымаць новыя нечаканыя ўражанні? Напрыклад, пабыць суткі знакамітым акцёрам альбо за сорак дзён пазнаёміцца з сарака дзяўчынамі з сарака розных краін. А хтосьці прагне апынуцца ў антычнай Грэцыі альбо наогул у прыдуманай казачнай краіне...

Усё гэта, як ні дзіўна, магчыма. Трэба толькі наведацца ў офіс адной амерыканскай фірмы, супрацоўнікі якой і займаюцца выкананнем жаданняў. Як кажуць, любы капрыз за вашыя грошы.

Праўда, фінансы немалыя. Як мінімум – 150 тысяч долараў. Максімум жа неабмежаваны...

Прадстаўнік гэтай прафесіі ўнікальны і жыве ў Стакгольме. Гэта жанчына Эльфрыда Карлсан, якая ўмее віртуозна і разнастайна брахаць. Чым і зарабляе на жыццё.

Шведы, якія маюць сабак, павінны плаціць спецыяльны падатак. Але некаторыя з грамадзян не спяшаюцца паведамляць у падатковыя службы пра набыццё чацвераногага сябра. Задача Эльфрыды Карлсан – выяўляць такіх несумленных аматараў жывёл.

У яе абавязкі ўваходзіць хадзіць па вуліцах і... брахаць на розныя лады. І калі з дома, гаспадары якога не рэгістравалі сабаку, пачуецца ў адказ брэх – значыць, парушальнік выяўлены і будзе прыцягнуты да адказнасці.

Дарэчы, па брэху Эльфрыда можа вызначыць не толькі наяўнасць у доме сабакі, але і яго пароду і нават узрост. Здаецца, прозвішча Карлсан ёй усё ж варта памяняць.

Ёсць, аказваецца, і такая работа. Праўда, толькі для маладых жанчын. Знаходзяцца яны ў нью-ёркскім Новым музеі сучаснага мастацтва. Іх абавязкі заключаюцца ў тым, каб прыйсці раніцай на працу, выпіць снатворнае і потым увесь дзень спаць у якасці экспанату. Уяўляеце: вы на працы адпачываеце, а за гэта яшчэ і грошы плацяць. Не работа, а мара!

Дэгустатары бываюць розныя. Адна справа – дэгуставаць каву, шакалад альбо спіртныя напоі, і зусім іншая – каціны корм. Дарэчы, перад запускам у продаж гэты прадукт праходзіць вельмі строгі кантроль. Але ж не паставіш дэгустатарам ката. Харч ён, вядома, з'есць з задавальненнем, вось толькі пра ўражанні нічога паведаміць не зможа. Тут патрэбны чалавек...

У абавязкі такога спецыяліста ўваходзіць наступнае. Спачатку эксперт павінен максімальна наблізіць твар да міскі з кормам і як след удыхнуць пах, каб зразумець, якой ён свежасці. Потым неабходна апусціць рукі ў спажыву, каб перабраць яе пальцамі і ўпэўніцца ў адсутнасці кавалачкаў касцей. І напрыканцы – пакаштаваць харч на смак...

У кандыдатаў на гэтую пасаду павінны быць, як і ў любога дэгустатара, добры нюх і развітыя смакавыя рэцэптары. Ну і, безумоўна, моцны страўнік.

Анекдоты
ад калектыву
ДУК «Уздзенская
цэнтральная
раённая бібліятэка
імя Паўлюка Труса»

– Ой, якая прыгожая маска!

– Не чапай, гэта на Новы год!

* * *

На ёлачным кірмашы.

– Мужчына, вы купляеце ці не? Колькі можна кратаць?

– А ў вас ёсць такая, але каб з мяккімі іголкамі?

– У вас што, маленькія дзеці?

– Ды не, кот.

* * *

Купіла на Новы год дзве машынкі на радыёкіраванні, каб муж не адбіраў падарунак у сына.

* * *

– Я сваёй падарыў на Новы год залатыя завушніцы, а яна мне – адэкалон!

– А ты што, таксама хацеў залатыя завушніцы?

* * *

Да Новага года планавала скінуць дзесяць кілаграмаў. Засталося ўсяго пятнаццаць...

* * *

Новы год – гэта час, калі сілкуешся салатамі, шампанскім і надзеямі, якім не суджана збыцца.

* * *

На Новы год чалавек на 80 працэнтаў складаецца з алкаголю і на 20 – з салаты «Аліўе».

* * *

– Што табе падарылі на Новы год?

– Бачыш, вунь пад акном шасцісоты «Мерсэдэс» стаіць, бірузовы?

– Ого, класная машына!

– Вось дакладана такога ж колеру кепачку...

16+

«Вожык» – грамадска-палітычны, літаратурна-мастацкі часопіс

№ 12 (1587), 2020 год.
Выдаецца з ліпеня 1941 года.

Заснавальнікі: Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Галоўны рэдактар
Юлія Францаўна ЗАРЭЦКАЯ.

Рэдакцыйная калегія: Сяргей ВОЛКАЎ, Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ, Мікола ГІРГЕЛЬ, Юлія ЗАРЭЦКАЯ, Міхась КАВАЛЁЎ, Казімір КАМЕЙША, Алег КАРПОВІЧ, Міхась ПАЗНЯКОЎ, Уладзімір САЛАМАХА, Васіль ТКАЧОЎ, Мікола ШАБОВІЧ.

Рэдакцыя: Аляксандр КАРШАКЕВІЧ *(намеснік галоўнага рэдактара, мастацкі аддзел)*, Алена КЕДА *(аддзел фельетонаў і пісьмаў)*, Вераніка МАНДЗІК *(аддзел літаратуры)*, Кацярына АКУЛІЧ *(мастацкі аддзел)*.

Адрас рэдакцыі
Юрыдычны адрас: Рэспубліка Беларусь, 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 а.
E-mail: info@zviazda.minsk.by.

Паштовы адрас: Рэспубліка Беларусь, 220034, г. Мінск, вул. Захарава, 19.
E-mail: a-vojik@yandex.by;
Тэлефон галоўнага рэдактара, намесніка галоўнага рэдактара, аддзелаў фельетонаў і пісьмаў, літаратуры, мастацкага – 244-92-37, бухгалтэрыі – 287-18-81, факс – 284-84-61.

Падпісныя індэксы:
74844 – індывідуальны, 01380 – індывідуальны льготны,
748442 – ведамасны, 01381 – ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 520 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»
Дырэктар – галоўны рэдактар Аляксандр Мікалаевіч КАРЛЮКЕВІЧ

Камп'ютарная вёрстка: Святлана ТАРГОНСКАЯ
Стыльрэдактар: Марыя ГІЛЕВІЧ

Падпісана да друку 08.12.2020. Фармат 60х84 1/8. Афсетны друк.
Папера афсетная. Ум. друк. арк. 2,79.
Ул.-выд. арк. 3,43. Тыраж 491 экз. Заказ .

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «БудМедыяПраект».
ЛП № 02330/71 ад 23.01.2014, вул. В. Харужай, 13/61, 220123, Мінск, Рэспубліка Беларусь.

Матэрыялы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца, прымаюцца толькі ў электронным выглядзе.
Перадрукоўваючы матэрыял, трэба абавязкова спасылацца на «Вожык».
Аўтары публікацый нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў.
Рэдакцыя можа друкаваць матэрыялы, не падзяляючы пазіцыю і думку аўтараў.

© Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, 2020
© РВУ «Выдавецкі дом «Звязда», 2020

Уладзімір ЧУГЛАЗАЎ.

Адказы на крыжаванку «Навагоднія смяшынкі» *(стар. 21)*

Па гарызанталі:

2. Ход. **3.** Карагод. **8.** Зад. **11.** Сонца. **12.** Парог. **13.** Мужык. **14.** Вожык. **19.** Продаж. **20.** Ляснік. **21.** Народ. **23.** Гутарка. **24.** Баразна. **25.** Тры.

Па вертыкалі:

1. Сподачак. **4.** Ас. **5.** Ох. **6.** Пасаж. **7.** Канькі. **9.** Карова. **10.** Багаж. **15.** Холад. **16.** Зайка. **17.** Цяжар. **18.** Янтар. **22.** Рыцар.

2021 Вожык

СТУДЗЕНЬ

ПН.	АЎТ.	СР.	ЧЦ.	ПТ.	СБ.	НД.
				1	2	3
4	5	6	7	8	9	10
11	12	13	14	15	16	17
18	19	20	21	22	23	24
25	26	27	28	29	30	31

ЛЮТЫ

ПН.	АЎТ.	СР.	ЧЦ.	ПТ.	СБ.	НД.
1	2	3	4	5	6	7
8	9	10	11	12	13	14
15	16	17	18	19	20	21
22	23	24	25	26	27	28

САКАВІК

ПН.	АЎТ.	СР.	ЧЦ.	ПТ.	СБ.	НД.
1	2	3	4	5	6	7
8	9	10	11	12	13	14
15	16	17	18	19	20	21
22	23	24	25	26	27	28
29	30	31				

КРАСАВІК

ПН.	АЎТ.	СР.	ЧЦ.	ПТ.	СБ.	НД.
			1	2	3	4
5	6	7	8	9	10	11
12	13	14	15	16	17	18
19	20	21	22	23	24	25
26	27	28	29	30		

МАЙ

ПН.	АЎТ.	СР.	ЧЦ.	ПТ.	СБ.	НД.
					1	2
3	4	5	6	7	8	9
10	11	12	13	14	15	16
17	18	19	20	21	22	23
24	25	26	27	28	29	30
31						

ЧЭРВЕНЬ

ПН.	АЎТ.	СР.	ЧЦ.	ПТ.	СБ.	НД.
	1	2	3	4	5	6
7	8	9	10	11	12	13
14	15	16	17	18	19	20
21	22	23	24	25	26	27
28	29	30				

ЛІПЕНЬ

ПН.	АЎТ.	СР.	ЧЦ.	ПТ.	СБ.	НД.
			1	2	3	4
5	6	7	8	9	10	11
12	13	14	15	16	17	18
19	20	21	22	23	24	25
26	27	28	29	30	31	

ЖНІВЕНЬ

ПН.	АЎТ.	СР.	ЧЦ.	ПТ.	СБ.	НД.
						1
2	3	4	5	6	7	8
9	10	11	12	13	14	15
16	17	18	19	20	21	22
23	24	25	26	27	28	29
30	31					

ВЕРАСЕНЬ

ПН.	АЎТ.	СР.	ЧЦ.	ПТ.	СБ.	НД.
		1	2	3	4	5
6	7	8	9	10	11	12
13	14	15	16	17	18	19
20	21	22	23	24	25	26
27	28	29	30			

КАСТРЫЧНІК

ПН.	АЎТ.	СР.	ЧЦ.	ПТ.	СБ.	НД.
			1	2	3	
4	5	6	7	8	9	10
11	12	13	14	15	16	17
18	19	20	21	22	23	24
25	26	27	28	29	30	31

ЛІСТАПАД

ПН.	АЎТ.	СР.	ЧЦ.	ПТ.	СБ.	НД.
1	2	3	4	5	6	7
8	9	10	11	12	13	14
15	16	17	18	19	20	21
22	23	24	25	26	27	28
29	30					

СНЕЖАНЬ

ПН.	АЎТ.	СР.	ЧЦ.	ПТ.	СБ.	НД.
		1	2	3	4	5
6	7	8	9	10	11	12
13	14	15	16	17	18	19
20	21	22	23	24	25	26
27	28	29	30	31		

1941–2021 «Вожыку» 80 гадоў

Святочныя нерабочыя дні — Нерабочыя дні — Рабочыя дні (перанос)

Калядкі — добрыя святкі: бліны ды аладкі.

Святкуйце, адпачывайце ды пра падпіску на «Вожык» не забывайце!

Лёля БАГДАНОВІЧ

Як жа мы чакаем вас,
Калядныя святы!
Пальцам піханых каўбас
Ды сталоў багатых.

Пазбіралася радня —
Месца ўсім хапае...
Месяц зорчын да відна
Чаравік шукае.

Варажыла, незнарок
Кінула далёка.
А пасля пляла вянок
Беленькі з аблокаў.

Адшукаў той чаравік
Месяц зухаваты
І на тройцы вараных
Прыскакаў у сваты.

Млечным шляхам год ішоў
Ночкай зарападнаю,
І да шлюбу месяц вёў
Зорачку калядную...

г. Барысаў.

Чытайце ў наступным нумары:

Што такое карапеткі?

Чаму цёцю Кацю завуць у вёсцы Кацястрофа?

Калі трэба завязваць язык на вузел?

На якое відовішча можна глядзець бясконца?

Што галоўнае ў дыеце?

Нашы індэксы:

ІНДЫВІДУАЛЬНЫ — 74844,

ІНДЫВІДУАЛЬНЫ ЛЬГОТНЫ
(для жыхароў сельскай мясцовасці: райцэнтры і населеныя пункты раёнаў) — **01380**;

ВЕДАМАСНЫ — 748442,

ВЕДАМАСНЫ ЛЬГОТНЫ
(для ўстаноў Міністэрства культуры, Міністэрства адукацыі) — **01381.**

Падпісацца можна ў любым аддзяленні сувязі РУП «Белпошта» (у тым ліку самастойна аформіць інтэрнэт-падпіску — на сайце «Выдавецкага дома «Звязда» ў раздзеле «Падпіска» ёсць падрабязная інструкцыя).

Праз аддзяленні сувязі можна аформіць падпіску на абаненцкую скрыню, з дастаўкай да кватэры «з уручэннем з рук у рукі».

РУП «Белсаюздрук» ажыццяўляе прыём падпіскі ў кіёсках і «Да запатрабавання».

А яшчэ — па інтэрнэце (з дапамогай пластыкавых электронных картак, электронных грошай) ці праз аўтаматызаваную сістэму Адзінай разлікова-інфармацыйнай прасторы (АРІП).

Таксама ў вас ёсць магчымасць атрымаць свежы нумар напярэдадні выхаду папяровага варыянта. Для гэтага патрэбна аформіць падпіску на PDF-версію выдання (на сайце «Выдавецкага дома «Звязда» ў раздзеле «Падпіска» ёсць падрабязная інструкцыя). Даступна падпіска і на папярэднія нумары: у прыватнасці, архіў 2018 і 2019 гадоў.

ПАДПІСКА НА І ПАЎГОДДЗЕ 2021 ГОДА

Падпіска на 1 месяц каштуе:
індэкс 74844, цана 6 рублёў 36 капеек,
індэкс 01380, цана 5 рублёў 32 капейкі,
індэкс 748442, цана 18 рублёў 54 капейкі,
індэкс 01381, цана 14 рублёў 94 капейкі.

9 770132 595002 20012